**24.** *Анафара* – гэта … .

**А)** прыём увасаблення паэтычнай ідэі ў мастацкім творы апасродкавана, шляхам намёку на агульнавядомыя факты ці з'явы. **Б)** завершаны па думцы і форме невялікі па аб'ёме лірычны або ліра-эпічны твор, напісаны вершаванай мовай. **В)** мастацкае падкрэсліванне істотнай прыметы якога-небудзь прадмета ці з'вы. **Г)** від рыфмы, у якой супадаюць толькі націскныя галосныя гукі. **Д)** паўтор аднолькавых гукаспалучэнняў, слоў ці выразаў у пачатку вершаваных радкоў або суседніх строф.

---

**25.** Дадзены назоўнікі: *а) механік; б) мецэнат; в) фалерыст*.

Суаднясіце іх са значэннямі:

*1) чалавек, які назірае за работай машын; 2) чалавек, які калекцыяніруе значкі і розныя нагрудныя знакі адрознення; 3) чалавек, які спрыяе развіццю мастацтваў, навук і аказвае ім фінансавую падтрымку.*

**А)** а-1, б-2, в-3. **Б)** а-1, б-3, в-2. **В)** а-2, б-1, в-3. **Г)** а-3, б-2, в-1. **Д)** а-3, б-1, в-2.

---

**26.** Выберыце з прапанаваных нескланяльныя назоўнікі.

*1) стрэмя; 2) цяля; 3) мадам; 4) рагу.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** няма такіх назоўнікаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**27.** Якое слова прапушчана ў народным выслоўі?

*Абібокам жыць – толькі … капціць.*

**А)** сала. **Б)** каўбасы. **В)** галаву. **Г)** неба. **Д)** вопратку.

---

**28.** Дадзены імёны герояў мастацкіх твораў*:*

*а) Косця; б) Тэкля; в) Сцяпан.*

Суаднясіце імёны герояў і назвы твораў:

*1) Васіль Быкаў "Незагойная рана"; 2) Віктар Карамазаў "Дзяльба кабанчыка"; 3) Іван Навуменка "Настаўнік чарчэння".*

**А)** а-1, б-2, в-3. **Б)** а-1, б-3, в-2. **В)** а-2, б-1, в-3. **Г)** а-3, б-2, в-1. **Д)** а-3, б-1, в-2.

---

**29.** Паэма Канстанціна Вераніцына "Тарас на Парнасе" была ўвекавечана скульптарамі ў кампазіцыі "Тарас на Парнасе", якая ўстаноўлена ў … .

**А)** Астраўлянах. **Б)** Гарадку. **В)** Віцебску. **Г)** Ашмянах. **Д)** Пінску.

---

**30.** Хто з класікаў беларускай літаратуры ў свой час сказаў: "Кніга – настаўнік жыцця"?

**А)** Іван Фёдараў. **Б)** Янка Сіпакоў. **В)** Іван Мележ.
**Г)** Іван Шамякін. **Д)** Янка Брыль.

---

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб'яднанне «Інтэлектуальныя спаборніцтвы «Конкурс»
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/
КОНКУРС
Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 7. Тыраж 7100 экз. Мінск. 2025 г.

# Гульня-конкурс па беларускай мове і літаратуры
# «БУСЛІК-2025»

*Чацвер, 13 лютага 2025 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–2 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 10-11 класаў

**1.** Якое слова прапушчана ў народным выразе?

*Лыжка дзёгцю ў бочцы … .*

**А)** вады. **Б)** капусты. **В)** мёду. **Г)** солі. **Д)** снегу.

---

**2.** Вызначце з прапанаваных словы, у якіх на канцы вымаўляецца **[*т*]**.

*1) горад; 2) спорт; 3) холад; 4) статыст.*

**А)** усе словы. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

---

**3.** Якая літара знаходзіцца пасля літары ***ж*** у беларускім алфавіце?

**А)** і. **Б)** з. **В)** ё. **Г)** к. **Д)** й.

---

**4.** Дадзена загадка:

*Не жывыя, а пішчаць без злосці кожны раз, як прыязджаюць госці.*

Знайдзіце адгадку ў пераблытаных літарах.

**А)** ы, в, о, т, а, р. **Б)** ы, р, у, т, к, а, я, н. **В)** ы, в, д, ё, р.
**Г)** в, а, л, і, к, п, а, і. **Д)** ы, к, о, н, в.

---

**5.** Якое слова прапушчана ў народным выслоўі?

*Лёгкі здабытак – … пражытак.*

**А)** дрэнны. **Б)** ненадзейны. **В)** цяжкі. **Г)** лёгкі. **Д)** невыносны.

**6.** Вызначце няправільна напісанае(-ыя) слова(-ы):

*1) пляяда; 2) завязь; 3) лягенда; 4) цецярук.*

**А)** усе словы. **Б)** 1. **В)** 2, 4. **Г)** 3. **Д)** 1, 4.

---

**7.** Якое слова з прапанаваных можа ўжывацца ў якасці назоўніка і ў якасці лічэбніка?

*1) шосты; 2) пяты; 3) левы; 4) дробны.*

**А)** няма такога слова. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**8.** Званне, якое прысуджаецца за выдатныя заслугі ў галіне навукі, мастацтва, называецца … .

**А)** дыпламант. **Б)** дыпламат. **В)** дыпломнік. **Г)** лаўрэат. **Д)** выдатнік.

---

**9.** Вызначце, якія з дадзеных слоў напісаны няправільна.

*1) адлюстраванне; 2) загоенны; 3) люстранны.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**10.** Дадзены сказы: *1. Шыла ў мяшку не схаваеш.*

*2. Напішы, мой сябар, ліст з дарогі.*

*3. Прыгожае дрэнным не стане.*

Вызначце двухсастаўны сказ.

**А)** усе сказы. **Б)** няма такога сказа. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

**11.** Якія дзеепрыметнікі з прапанаваных напісаны правільна?

*1) засеяны; 2) звезяны; 3) намаляваны; 4) скошанны.*

**А)** усе дзеепрыметнікі. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

---

**12.** Выберыце з дадзеных словы, у якіх на месцы пропуску неабходна напісаць апостраф.

*1) рэл..еф; 2) пер..е; 3) шампін..ён; 4) інтэрв..ю.*

**А)** усе словы. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

---

**13.** Дадзены прыметнікі: *1) рэформенны; 2) сонны; 3) драўлянны.*

Вызначце правільна напісаныя прыклады.

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільна напісаных прыкладаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**14.** Вызначце з прапанаваных дробавыя лічэбнікі.

*1) паўтара; 2) абое; 3) пяць сёмых; 4) чацвёра.*

**А)** усе лічэбнікі. **Б)** няма такіх лічэбнікаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 4.

---

**15.** Дадзены прыклады:

*1) падкаленны; 2) насенне; 3) аддаць; 4) ладдзя.*

У якіх словах адбылося падваенне зычных?

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** у 1, 2. **В)** у 1, 3. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 2, 4.

**16.** Дадзены сказы: *1) Пасябравалі з вучнем Петрыкавым;*

*2) Добрыя ўспаміны звязаны з горадам Петрыкавым;*

*3) Павіталіся з Андрэем Рагачовым.*

У якіх прыкладах уласныя назоўнікі напісаны правільна?

**А)** ва ўсіх прыкладах. **Б)** няма такіх прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 1, 3.

---

**17.** Выберыце з прапанаваных рознаспрагальныя дзеясловы.

*1) есці; 2) бегчы; 3) шукаць.*

**А)** усе дзеясловы. **Б)** няма такіх дзеясловаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**18.** Дадзены ўстойлівыя спалучэнні:

*а) гула асмаленая; б) кішкі пераесці; в) сухоты кішаньковыя.*

Падбярыце словы-сінонімы:

*1) абрыднуць; 2) безграшоўе; 3) анічога.*

**А)** а-1, б-2, в-3. **Б)** а-2, б-3, в-1. **В)** а-2, б-1, в-3. **Г)** а-3, б-2, в-1. **Д)** а-3, б-1, в-2.

---

**19.** Якія бываюць злучнікі паводле функцыянальнага прызначэння? Выберыце патрэбны варыянт.

*1) вытворныя і невытворныя; 2) простыя і састаўныя;*

*3) адзіночныя і паўторныя; 4) злучальныя і падпарадкавальныя.*

**А)** усе варыянты. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**20.** Якім членам сказа з’яўляецца выдзеленае слова?

*Падзелім **дваццаць** на пяць.*

**А)** дзейнікам. **Б)** выказнікам. **В)** дапаўненнем.
**Г)** азначэннем. **Д)** акалічнасцю.

---

**21.** Выберыце з прапанаваных назоўнікі, якія ў форме меснага склону адзіночнага ліку маюць канчатак ***-ю***.

*1) сузор’е; 2) поле; 3) каваль; 4) вучань.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** 1, 2. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

---

**22.** У якіх словах на месцы пропуску напішаце літару ***я***?

*1) і..рогліф; 2) аві..тар; 3) і..нізацыя; 4) клаві..тура.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** у 1, 2. **В)** у 1, 3. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 2, 4.

---

**23.** Дадзены сказ: *Бабуля прышыла **аплік**.*

Якое значэнне мае выдзеленае слова?

**А)** зашпілька для петляў адзення, звычайна ў выглядзе кружка. **Б)** металічны кручок для зашпільвання адзення. **В)** ажурныя сятчатыя вырабы з ільняных, шаўковых і іншых нітак для аздобы бялізны, адзення. **Г)** ушыты або прышыты зверху адзення мяшочак для дробных рэчаў і грошай. **Д)** частка адзення, якая пакрывае руку.